**Назва ТВП:** Гронава

© С. Левый

**Код:** BY027

**Геаграфічныя каардынаты:** 53° 34' N 31° 24' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Магілёўская вобласць: Чэрыкаўскі раён

**Плошча:** 763 га

**Крытэрыі:** A1

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** не мае

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** ТВП міжнародна значнасці

## Агульнае апісанне:

Тэрыторыя знаходзіцца ў пойме р. Сож. Паўночная частка – поймавыя лугі пераважна адчыненыя з невялікімі курцінамі хмызнякоў і верб. Тэрыторыя мае ўзвышанныя ўчасткі, якія чаргуюцца з паніжэннямі, часта залітымі вадой. Луг па левабярэжжы актыўна выкарыстоўваецца для выпаса кароў.

Левы бераг ракі ў межах тэрыторыі абрывісты вышынёй 1,5 - 4 метра, на невялікім участку пакрыты хваёвым лесам, правы бераг - спадзісты, парослы вярбой.

Участак лесу ў межах ТВП плошчай 320 га. Пераважаюць саснякі, ў тым ліку

стараўзрастныя, чаргуюцца з высечкамі і маладнякамі. У першым квартале Вепрынскага лясніцтва Чэрыкаўскага лясгаса на плошчы 15 га знаходзіцца Рэспубліканскі батанічны помнік прыроды «Вепрынская дубрава». Дубрава ялова-кіслічная, узростам больш за 200 гадоў.

Насупраць ТВП на правым беразе знаходзіцца г. Чэрыкаў.

Тэрыторыя ТВП выкарыстоўваецца для выпаса кароў, лесагаспадарчай дзейнасці, рыбнай лоўлі і адпачынку.

## Асноўныя біятопы:

Разнатраўныя поймавыя лугі – 58%, саснова-дубовы лес па сухадолу – 42%.

## Птушкі:

Арнітафаўна ТВПдаследавана недастаткова. Поўны відавы склад птушак не вядомы.

На тэрыторыі ТВП Гронава знаходзіца самая вялікая ў Беларусі гнездавая групоўка сіваграка *Coracias garrulus*, вядомая на сёняшні дзень. У старавазрастным сасняку апошнія гады адзначаецца 8-10 пар. У пойме Сажа знаходзіцца даволі вялікі дупеліны ток – больш за 20 самцоў.

## Іншыя групы жывел:

даследванні на праводзіліс.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытерый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чапля-бугай *Botaurus stellaris* | гн | 1 с | 2012 | Д | | |
| Бусел белы *Ciconia ciconia* | зал | + | 2012 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды | Крытерый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Драч *Crex crex* | гн | 20-25 с | 2012 | Э | | |
| Баталён *Philomachus pugnax* | мг | + | 2012 | П | | |
| Дубальт *Gallinago media* | гн | 26-28 с | 2008 | Д | ↔ | А1 |
| Звычайны зімародак *Alcedo atthis* | гн | 3 п | 2009 | Д | | |
| Сіваграк сіні *Coracias garrulus* | гн | 8-10 п | 2009-2010 | Д | ↔ | А1 |
| Сокал-кабец *Falco subbuteo* | гн | 1 п | 2009 | Д | | |

## Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

не адзначана.

## Пагрозы:

Высечка старых дрэваў.

Зарастанне адкрытых біятопаў хмызнякамі.

## Рэкамендацыі па захаванню:

Забараніць высечку старых дрэваў.

Праводзіць мерапрыемствы па прадухіленню зарастання паплавоў хмызнякамі.

Стварыць біялагічны заказнік мясцовага значэння.

## Крыніцы інфармацыі:

Тарантовіч М.В., Монгін Э.

**Складальнікі :** Тарантовіч М.В., Монгін Э.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*